# Вучым беларускія народныя гульні

У беларускіх народных гульнях адлюстроўваецца лад жыцця людзей, іх праца, побыт, нацыянальныя асновы, ўяўленні аб гонару, адвазе, мужнасці. Асаблівасць народных гульняў у тым, што яны, маючы маральную аснову, вучаць малых здабываць гармонію з навакольным светам. На розных этапах гісторыі, яны дапамагаюць абудзіць ў чалавека любоў да роднай зямлі, развіваць цікавасць да нацыянальных традыцый і звычаяў.

Беларускія народныя гульні – рухавыя. Яны вызначаюцца багаццем разнастайных уздеянняў на арганізм дзяцей, фарміруюць у іх неабходныя фізічныя навыкі: удасканальваюць навыкі бегу (з лоўляй і ўхіленнем, у розных напрамках, са зменай тэмпу), хадзьбы па крузе, скачкі, практыкуюць ва ўменні ўзгадняць рухі са словамі, садзейнічаюць правільнаму фізічнаму развіцю, умацаванню здароўя, развіццю сілы, спрытнасці, назіральнасці, кемлівасці, удумлівасці, вытрымцы, пачуцця калектывізму, клопату пра іншых, любові да роднага краю, выхаванню пачуцця справядлівасці, а таксама садзейнічаюць працэсу разумення і авалодвання беларускай мовай.

Больш эфектыўнаму комплекснаму рашэнню аздараўленчых, адукацыйных і выхаваўчых задач спрыяе атмасфера радасці, якая ўзнікае пры правядзенні рухомых гульняў. Актыўныя рухі, абумоўленныя зместам гульні, выклікаюць у дзяцей станоўчыя эмоцыі і павялічваюць фізічныя працэсы. Большасць беларускіх рухомых гульняў патрабуе шмат фізічнай энергіі, спрытнасці, кемлівасці, у выніку чаго дзеці атрымліваюць добрую фізічную нагрузку, загартоўку.

Актыўнасць дзяцей у народных гульнях абумоўлена іх асабістай значнасцю, што ў дзіцячым разуменні вызначаецца як: «ўвесь свет знаходзіцца вакол мяне». Разнавіднасць беларускіх народных гульняў накіравана не толькі для стварэння своеасаблівай атмасферы, свята, але і для фізічнага і творчага выхавання дзіцяці.

Паважаныя бацькі! Каб правесці выхадны дзень у добрым, вясёлым настроі, прапануем Вам некаторыя гульні, у якія можна пагуляць разам са сваімі дзяцьмі.

## Мароз

**Мэта:** садзейнічае развіццю хуткасці, спрытнасці.

**Месца правядзення:** пляцоўка, зала.

**Апісанне гульні.** Гуляючыя з дапамогай лічылкі выбіраюць “Мароза” і разбягаюцца па пляцоўцы.

“Мароз” бяжыць за імі і стараецца дакрануцца да каго-небудзь. Той, да каго ён дакрануўся, лічыцца “замарожаным”, таму павінен спыніцца і развесці рукі ў бакі.

Іншыя гуляючыя могуць "размарозіць" яго, пляснуўшы рукой па плячы. Перамагае "Мароз", які здолее "замарозіць" большую колькасць гульцоў. Пасля кожных двух-трох хвілін выбіраецца новы "Мароз".

**Лічылка**

Ты халодны,
Ты марозны,
Ты ў кажусе,
Ты ў латусе,
А ў цябе чырвоны нос,
Гэта ты – дзед Мароз!

## Шэры кот

***Мэта:*** удасканальваць навыкі хадзьбы і бегу ў калоне. Выхоўваць смеласць, спрыт, хуткасць рэакцыі.

***Апісанне гульні:*** дзеці выбіраюць ката па лічылцы:

*Раз, два, тры, чатыры*
*Ката грамаце вучылі:*
*Не чытаць, не пісаць,*
*А за мышкамі скакаць.*

Мышы становяцца за Катом у калону. Калона рухаецца па пляцоўцы. Паміж Катом і мышамі ідзе размова:

— *Ёсць мышы ў стозе?*
— *Ёсць!*
— *Баяцца ката?*
— *Не!*
— *А я, катафей, разганю ўсіх мышэй!*

Мышы разбягаюцца, кот іх ловіць.

***Правілы гульні:*** дзеці павінны знаходзіцца ў калоне да слоў: *«...разганю ўсіх мышэй»* і вымаўляць тэкст павінны дакладна, зразумела.

## Прэла-гарэла

**Мэта:** садзейнічае развіццю ўвагі, назіральнасці, інтуіцыі.

**Месца правядзення:** пляцоўка, зала.

**Інвентар:** набор невялікіх прадметаў (рознакаляровыя кубікі, шышкі).

**Апісанне гульні:** вядучы ў розных месцах хавае прадметы, гаворачы пры гэтым:

*Прэла-гарэла,*
*За мора ляцела,*
*А як прыляцела,*
*Дык недзе і села.*
*Хто першы знойдзе,*
*Той сабе возьме!*

Пасля гэтых слоў усе разбягаюцца па пляцоўцы і шукаюць схаваныя прадметы.

Хто знойдзе больш за усіх, той і выйграў.

Гульцы пачынаюць шукаць прадметы толькі пасля таго, як сказаны ўсе словы.
У той час, калі вядучы хавае прадметы, усе павінны стаяць спіной да яго з заплюшчанымі вачыма.

## Міхасік

**Мэта:** садзейнічаць развіццю хуткасці, спрытнасці.
**Інвентар:** абручы або кольцы дыяметрам да 50 см.
**Месца правядзення:** зала, пляцоўка.
**Апісанне гульні:** для правядзення гульні патрэбна мець некалькі кольцаў дыяметрам да 50 см., але іх павінна быць на адно менш, чым гульцоў.
Кольцы (або абручы) раскладваюцца па крузе, вакол іх становяцца гульцы. Адзін з гуляючых гаворыць такія словы:
*Ты, Міхаська, не зявай, не зявай!*
*Лапаточкі абувай, абувай!*
**Правілы гульні:** гучыць беларуская народная мелодыя, гульцы танцуючы рухаюцца па крузе. Як толькі музыка заканчваецца, усе спыняюцца і стараюцца як мага хутчэй "абуць лапці" – заняць свабоднае месца у адным з кольцаў. Гулец, які застаўся без "лапцяў", выбывае з гульні.
Пасля гэтага забіраецца яшчэ адзін абруч, і гульня працягваецца да той пары, пакуль у крузе не застанецца адзін гулец. Ён лічыцца пераможцам.

## Лянок

***Мэта:*** практыкаваць ва ўменні ўзгадняць рухі са словамі песні. Выхоўваць пачуццё калектывізму, цікавасць да народнага фальклору.
***Апісанне гульні:*** з ліку тых, хто прымае ўдзел у гульні, выбіраецца «бабуля». Астатнія становяцца у круг. Яны пытаюцца:
— *Што ты, бабуля, нам праці дасі?*
Бабуля выходзіць у цэнтр круга і адказвае:
— *Старым бабулькам воўны пасмачку,*
*А прыгожым маладзічкам белы лянок!*
Пасля гэтага дзеці разам з бабуляй пачынаюць спяваць, паказваючы рухамі дзеянні, пра якія гаворыцца у песні:
*А мы сеялі, сеялі лянок,*
*Белы, слаўны кужалёк!*
*Урадзіся наш лянок!*
*Урадзіся кужалёк.*
*Мы лянок ірвалі, жалі,*
*У снапочкі збіралі.*
*Урадзіуся лянок*
*Белы, слаўны кужалёк.*
***Правілы гульні:*** дзеці павінны дакладна выконваць дзеянні, якія паказвае «бабуля».